**Маніторынг гістарычнай палітыкі (лістапад 2021 – студзень 2022 года)**
**Аляксей Ластоўскі**

Метадалогія: для маніторынгу выкарыстоўваліся публікацыі ў асноўных беларускіх СМІ, як дзяржаўных, так і нядзяржаўных. Адбіраліся для фіксацыі і аналізу публікацыі, дзе згадкі пра гістарычнае мінулае звязваліся з актуальнай палітычнай сітуацыяй. Усяго за перыяд лістапад 2021 – студзень 2022 года былі прааналізаваны 141 публікацыя. На аснове адабраных публікацый рабіўся якасны аналіз з мэтай вызначэння асноўных тэндэнцый, асноўных мерапрыемстваў актараў, а таксама з уключэннем беларускага кейса ў больш шырокі кантэкст гістарычнай палітыкі ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе.

**Закон пра генацыд беларускага народа**

Як і прагназавалася ў папярэднім выпуску маніторынга гістарычнай палітыкі, досыць хуткімі тэмпамі ў Беларусі быў прыняты Закон пра генацыд беларускага народа. 9 снежня 2021 быў апублікаваны праект закона, ужо 14 снежня ён быў адобраны Палатай Прадстаўнікоў, і 5 студзеня 2022 года закон быў падпісаны Аляксандрам Лукашэнка, пасля чаго ён уступіў у сілу. У дадзеным выпадку найперш здзіўляе вельмі кароткі час паміж апублікаваннем праекта і яго прыняццем у парламенце, практычна без дыскусій і правак. Між тым, у законе маецца вельмі шмат недакладнасцей і нявызначаных фармуліровак, што адразу выклікала некалькі скептычных рэакцый ад беларускіх гісторыкаў[1] у незалежных СМІ (Алесь Пашкевіч, Аляксандр Фрыдман[2], Леанід Смілавіцкі[3]). У крытычных рэпліках адзначаліся наступныя хібы прынятага закону:

1. нявызначанасць фармуліровак, адсутнасць дакладнага вызначэння самога тэрміну “генацыд” і асабліва крытэрыяў “адмаўлення генацыду”, што паводле новага закону цягне за сабою крымінальную адказнасць[4];
2. практычнае атаясамленне ў тэксце закона (што экспліцытна выяўлена і ў храналагічных рамках ажыццяўлення генацыду – да 1951 г.) вынішчальнай палітыкі нацыстаў з дзейнасцю нацыяналістычных фармаванняў на тэрыторыі Беларусі, што практычна дае падставы падвесці пад гэты закон не толькі беларускія калабарацыяніцкія структуру, але і польскія, украінскія і літоўскія падпольныя арганізацыі (АК, АУН/УПА і г.д.);
3. адсутнасць асобнага вылучэння знішчальнай палітыкі нацыстаў у дачыненні да габрэяў і рома, што вядзе да практычнага атаясамлення розных этнічных катэгорый у адзінай усепаглынальнай катэгорыі “беларускіх грамадзян” без магчымасці дыферынцыяцыі акупацыйнай палітыкі;
4. небяспека прынятых юрыдычныя рэгламентацый для магчымасцей свабоднага і крытычнага прафесійнага гістарычнага вывучэння перыяду Другой сусветнай вайны.

З боку дадзеных экспертаў агульная ацэнка прынятага Закону пра генацыд беларускага народа была адназначна негатыўнай, але нейкай узгодненай рэакцыі ад гістарычнай супольнасці не прагучала, цалкам магчыма, што гэта было выклікана і бояззю магчымай рэпрэсіўнай рэакцыі (тым больш, што крытыкі закона практычна адразу былі падвергнутыя публічнаму шэльмаванню ў дзяржаўнай прэсе).

[1] У дадзеным выпадку важна адзначыць, што Аляксандр Фрыдман ужо даўно працуе ў Германіі, а Леанід Смілавіцкі – у Ізраілі.
[2] https://nashaniva.com/?c=ar&i=283230&lang=ru
[3] https://belsat.eu/news/27-01-2022-gistoryk-pra-skazhenni-u-zakone-ab-genatsydze-natsysty-nikoli-ne-zabivali-belarusau-za-toe-shto-yany-belarusy/
[4] https://www.youtube.com/watch?v=cqYR7iXxl_s

Відавочна, што размытыя фармуліроўкі закона пакідаюць справу інтэрпрэтацыі таго, што лічыць генацыдам і асабліва адмаўленне генацыду, у межах кампетэнцыі судзебных органаў. Тым не менш, у першыя месяцы пасля прыняцця закону ён не выкарыстоўваўся ў якасці рэпрэсіўнага механізму, што пакідае пад пытаннем як на практыцы закон будзе працаваць для пакарання за адмаўленне генацыду.

Асноўнай дзяржаўнай інстытуцыяй, якая прынялася за справу генацыду беларускага народу, стала Дзяржаўная пракуратура РБ. Пры гэтым не быў скарыстаны досвед усходнееўрапейскіх краін (Польшчы, Украіны, Германіі і г.д.), дзе распрацоўка “цёмных старонак” гісторыі ХХ стагоддзя была аддадзеная ў кампетэнцыю адмыслова створаных інстытуцый (такіх як Інстытут нацыянальнай памяці ў Польшчы, Украіне ці Славакіі), якія ўключалі б найперш прафесійных гісторыкаў, але мелі б шырокія паўнамоцтвы і рэгламентацыі дзейнасці архіваў, і па распачынанню судовых спраў. У беларускім выпадку гэта місія практычна цалкам манапалізаваная сілавымі структурамі, у той час як прафесійныя гісторыкі адціснутыя на другі план.

Што датычна практычнай дзейнасці супрацоўнікаў Генеральнай пракуратуры, то яны ўвесь 2021 год займаліся пошукам неідэнтыфікаваных пахаванняў часоў Другой сусветнай вайны, а таксама апытваннем патэнцыйных сведкаў вайсковых злачынстваў. Сродкам апублічвання праробленай следчай працы стала стварэнне па ўсёй Беларусі спецыяльнага цыклу музейных выстаў пад агульнай назвай “Без тэрміну даўнасці”[5], якія сталі разгортвацца па абласных і раённых музеях, а таксама ў Музеі Вялікай Айчыннай вайны. На гэтых выставах размяшчаліся архіўныя дакументы, якія сведчылі пра вайсковыя злачынствы, а таксама асобная ўвага надавалася свежым знаходкам няўлічаных пахаванняў ахвяр.

Пры гэтым застаецца дыскусійным пытанне, наколькі нававыяўленыя Генеральнай пракуратурай факты масавых забойстваў могуць весці для кардынальнага перагляду масштабу ахвяраў (умоўна кажучы, ад ацэнкі “кожны чацвёрты”, прынятай у БССР часоў Машэрава, да “кожнага трэцяга”, што стала агульнапрынятай формулай у апошнія гады ў Рэспубліцы Беларусь). Гэта патрабуе арганізацыі абмеркавання з прафесійнымі гісторыкамі, але на дадзены момант Генеральная пракуратура гэтага пазбягае, хоць анансавала на вясну правядзенне міжнароднай канферэнцыі (пры гэтым застаецца яшчэ і адкрытым пытанне, наколькі яна будзе адкрытай для прафесійнай даследчыцкай супольнасці).

Праблемным момантам для ініцыятараў справы пра генацыд беларускага народа застаецца міжнароднае прызнанне, на дадзены момант нават з боку Расіі не прагучала гатоўнасць гэта зрабіць. Генеральная пракуратура спрабуе працаваць па звыклай для сябе лініі, праз рассылку запытаў на пошук вайсковых злачынцаў, што ва ўмовах знешняга дэфіцыту легітымнасці для судовай сістэмы Рэспублікі Беларусі не дало ніякага практычнага эфекту, апроч падставаў для чарговай хвалі абвінавачванняў у адрас урадаў іншых краін у “падтрымцы нацызму”. Адзінае, спрэчнай застаецца пазіцыя Ізраіля, які працягвае супрацу з беларускімі дзяржаўнымі структурамі, не зважаючы на крытыку з боку ізраільскіх гісторыкаў. Тым не менш, і з гэтага боку падтрымка відавочна застанецца абмежаванай (выключна ў межах даследвання ажыццяўлення Халакосту), і прадказальна, што генацыд беларускага народу застанецца справай унутранага карыстання.

---

5 Сама назва для выстаў запазычаная з расійскага кантэксту, дзе падобныя выставы ў мінулыя гады арганізоўвалі ініцыятары справы пра генацыд савецкага народу.

**Юбілей, які не адбыўся**

Для Беларусі 1991 год стаў вызначальным для найноўшай гісторыі: ва ўмовах нарастання дэзінтэграцыйных працэсаў у СССР і пасля правалу путчу ГКЧП Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 25 жніўня 1991 года быў нададзены статус канстытуцыйнага закона, 19 верасня краіна атрымала актуальную назву - Рэспубліка Беларусь. Працэс стварэння СНД (і адначасовага дэмантажу СССР) прывёў і да дыпламатычнага прызнання незалежнасці Рэспублікі Беларусь, якое свой пачатак бярэ таксама напрыканцы 1991 года. Такім чынам, у 2021 годзе ў Беларусі можна было б адзначыць 30-годдзе незалежнасці, як гэта адбылося ў шмат якіх іншых постсавецкіх рэспубліках. Тым не менш, гэтага не адбылося, прычыны тут комплексныя, паспрабуем з гэтым разабрацца.

Пачаць неабходна з таго, што ў беларускім грамадстве не так шмат пытанняў або тых, па якіх існуе ўстойлівы кансэнсус. Адна з такіх тэм - гэта пазітыўнае стаўленне да здабыцця незалежнасці. Гэта фіксуецца па розных сацыялагічных апытаннях, у тым ліку, якія праводзіліся ў 2020 (Satio) і 2021 (Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі) гадах.

Але разам з тым, дыскурс улады (а гэта з 1994 года – дыскурс Лукашэнкі) у адносінах да здабыцця незалежнасці застаецца ўнутрана супярэчлівым. У час прэзідэнцкай кампаніі 1994 года Аляксандр Лукашэнка атрымаў пераканаўчую перамогу над прадстаўніком наменклатуры Вячаславам Кебічам у многім дзякуючы ўмеламу выкарыстанню прасавецкіх настрояў, супрацьпастаўляючы сімвалічны рэсурс савецкага мінулага суровым рэаліям палітычнага і эканамічнага крызісу першай паловы 1990-х. У наступныя гады Лукашэнка рэгулярна выяўляў сябе ў якасці адзінага дэпутата Вярхоўнага савета БССР, які прагаласаваў супраць зацвярджэння Белавежскіх пагадненняў (і такім чынам, у рамантычнай ролі апошняга абаронцы СССР). І разам з тым, ён прыйшоў да ўлады ў выніку распаду Савецкага Саюза, 27 гадоў узначальвае Рэспубліку Беларусь, і ўвесь час рэпрэзентуе сябе як абаронца незалежнасці і суверэнітэту краіны. Такім чынам, мы бачым тут выбудоўванне пэўнай генеалогіі - Рэспубліка Беларусь становіцца пазітыўным працягам БССР, дзе захоўваюцца сістэма сацыяльнай абароны, прамысловая вытворчасць, памяць аб Вялікай Айчыннай вайне. Адпаведна, перыяд з 1991 па 1994 год расцэньваецца не як пачатак незалежнай беларускай дзяржаўнасці, а як адхіленне ад натуральнай лініі развіцця, як траўма, выкліканая ўздзеяннем знешніх сіл.

Такая дэкларатыўная пераемнасць з вопытам савецкай беларускай дзяржаўнасці не павінна хаваць зменаў, якія адбываюцца, паколькі ідэалагічны і палітычны праект Лукашэнкі мае ўласную логіку развіцця, дзе прагматычныя задачы значна важнейшыя за захаванне вернасці камуністычнай спадчыне. Многія сацыяльныя гарантыі былі падвергнуты рэвізіі, сацыялістычная эканоміка была пераўтворана ў варыянт дзяржаўнага капіталізму, камуністычная ідэалогія была цалкам адкінутая, пафас рэвалюцыйных пераўтварэнняў і класавай барацьбы абсалютна чужы гэтай уладзе.

Накладанне гэтых двух фактараў (супярэчлівасці інтэрпрэтацыі пераходнага перыяду і ўцягнутасці ў іншыя мемарыяльныя ініцыятывы) прывялі да таго, што беларуская ўлада фактычна адмовілася якім-небудзь чынам адзначаць 30-годдзе Рэспублікі Беларусь. Гэта азначае, што ў 2021 годзе не было ніякіх афіцыйных прымеркаваных мерапрыемстваў: ні парадаў, ні ўрачыстых канцэртаў, ні музейных выставак, ні навуковых канферэнцый. Характэрна, што ў традыцыйным віншаванні на Дзень Незалежнасці прэзідэнта краіны

нават не ўзгадваецца 30-годдзе Рэспублікі Беларусь, прысутнічаюць толькі дасылкі да Вялікай Айчыннай вайны.

Толькі, уласна, 30-годдзе распаду Савецкага Саюза было ўспрынята як належная нагода для рэфлексіі, у першую чаргу дзяржаўнымі СМІ, якія традыцыйна звярнуліся да парадыгмы "найбуйнейшай геапалітычнай катастрофы".

Адмысловае значэнне ў інтэрпрэтацыі гэтых падзей набыло пытанне адказнасці - хто вінаваты ў распадзе СССР? Пры гэтым дамінантным аказаўся топас "здраднікаў" для характарыстыкі кіраўніцтва краіны. Тут мы бачым накладанне публічнага дыскурсу пасляпратэстнага перыяду, калі для палітычных мэт дыскрэдытацыі сваіх апанентаў прыхільнікамі ўлады пачаў актыўна выкарыстоўвацца цэтлік «здраднікаў». У такой рыторыцы пратэстуючыя здраджваюць інтарэсам сваёй краіны (разбураючы парадак і дабрабыт дзеля мэт варожа настроеных заходніх краін, якія насамрэч і стаяць «за кулісамі» пратэстаў і імі кіруюць), такая логіка адчужэння дазваляе ўнутраныя праблемы цалкам тлумачыць інтрыгамі знешніх акцёраў. Важным сімвалічным механізмам дыскрэдытацыі "здраднікаў" было і іх атаясамліванне з калабарантамі перыяду нацысцкай акупацыі, што дазваляе выкарыстоўваць магутны эмацыйны рэсурс Вялікай Айчыннай вайны. Паміж «прыслужнікамі Гітлера» і ўдзельнікамі пратэстаў лета-восені 2020 г. была праведзена роўнасць, паколькі гэта ўсё «здраднікі».

У такім жа ключы абмяркоўваўся і распад СССР у 1991 годзе: "*развал СССР — это прежде всего результат преступных замыслов или политической импотенции правящей верхушки Советского Союза*»[6], «*они все были долгие годы «истовыми коммунистами» и предали ту партию, которая подняла их наверх*»[7]. Больш за тое, і ў гэтым выпадку выкарыстоўваецца эмацыйная дасылка да супрацоўніцтва з нацыстамі (у чым абвінавачваецца нават Міхаіл Гарбачоў): «*Говорят, во время войны в Ставропольском крае немцам очень понравился один мальчик. Они его называли малшик-помашка. Потому что он за конфетки и похлопывание по щечке готов был даже в сортир к фрицам с бумажкой бежать. Звали мальчика Мишка. И через 40 лет этот самый малшик-помашка ради того, чтобы в очередной раз подмазать своим любимым западным хозяевам, уничтожил величайшую державу в истории человечества. И сегодня 30 лет преступлению тысячелетия*»[8]. Зноў жа, немагчыма пазбегнуць супастаўленняў з сучаснасцю, і кіраўніцтву КПСС, якое здрадзіла сваёй краіне, супрацьпастаўляецца Аляксандр Лукашэнка, які ў сітуацыі крызісу праявіў радыкальна іншыя якасці.

Іншая важная рыса інтэрпрэтацыі распаду Савецкага Саюза - гэта выбудоўванне вобразу "вечнага ворага" з заходніх краін, уваскрашаецца цывілізацыйная ідэя аб адвечным супрацьстаянні "рускага свету" "калектыўнаму Захаду", не толькі пабудаванаму на чужых каштоўнасцях, але і пастаянна імкнецца над панаваннем свету. Адпаведна, і ў дэзінтэграцыі савецкага праекта бачацца найперш інтрыгі заходніх спецслужбаў, накіраваныя на разбурэнне галоўнага саперніка гэтым планам панавання. І зноў мы бачым паралелі з актуальнай сітуацыяй "*гибридной войны, развернутой так называемыми демократическими западными странами против народов Беларуси и России* ", дзе "Захад"

[6] https://www.sb.by/articles/vmeste-my-silnee33.html
[7] https://www.sb.by/articles/yubiley-kotoryy-ne-raduet.html
[8] http://www.ctv.by/azaryonok-perestroyka-eto-byla-specoperaciya-soznatelnaya-holodnaya-cinichnaya-i-podlaya

зноў паўстае галоўным ворагам беларускай дзяржаўнасці, які ініцыюе пратэсты і спрабуе задушыць краіну санкцыямі[9].

У такім ракурсе крызісныя з'явы ў апошні перыяд існавання Савецкага Саюза альбо прымяншаюцца, альбо тлумачацца няўдалымі/здрадніцкімі дзеяннямі саюзнага кіраўніцтва. Такім чынам, СССР мог бы абнавіцца і існаваць далей: "мы можам сцвярджаць, што савецкі лад у БССР (можа быць, па кітайскім узоры, можа быць, па сваім уласным) мог бы захоўвацца і да гэтага часу". Разбуральным стратэгіям дэзінтэграцыі супрацьпастаўляюцца інтэграцыйныя праекты - саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, Еўразійскі эканамічны саюз, якія не толькі паўстаюць у якасці паступовага аднаўлення нарматыўнага парадку, але і як важны інструмент, які дазваляе выстаяць у гібрыднай вайне з "калектыўным Захадам".

Такім чынам, у 2021 годзе ў Беларусі практычна незаўважаным аказалася 30-годдзе суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, у сілу зрушэння ідэалагічных акцэнтаў. Але для праўладнай палітычнай рыторыкі, якая «нармалізуе» культурна-палітычны ландшафт, аказаўся значным кейс распаду СССР, які дазваляе зноў асудзіць «здраднікаў» і прадэманстраваць перавагі палітычнага курсу А.Г. Лукашэнку.

**2022 - Год гістарычнай памяці**

Іншай важнай ініцыятывай беларускай дзяржавы ў плане гістарычнай палітыкі стала прызначэннем 2022 года Годам гістарычнай памяці. Гэта ў сваю чаргу працягвала сімвалічную палітыку па перакадзіраванню нацыянальнай ідэнтычнасці з дапамогай звароту да гістарычных рэсурсаў, якая ажыццяўлялася і ў 2021 годзе, які прайшоў пад эгідай Года народнага адзінства (сімвалічнае адзінства беларускай нацыі мацавалася за кошт звароту да аб’яднання беларускага народа ў межах БССР пасля ўваходу савецкіх войскаў на тэрыторыю Заходняй Беларусі ў верасні 1939 года).

Абвяшчэнне Года гістарычнай памяці адбылося падчас навагодняга віншавальнага звароту Аляксандра Лукашэнкі: “*Беларусь помнит уроки прошлого. Поэтому в уходящем году мы вместе возродили традицию отмечать дату воссоединения белорусских земель. День народного единства стал государственным праздником - одним из символов становления белорусского национального государства. Это наша земля, это наша судьба, это наша история. И только мы будем ее вершить. Этого не изменить, пока в каждом из нас горит неугасаемое пламя любви к Родине. Ставя перед собой новые цели, мы знаем, что не в наших силах все предугадать, но в нашей власти в наступающем году определить для себя главное. Это то, что должно быть в памяти поколений и в сердце каждого. Это наши реальные истоки - та живительная сила, которая столетиями питала и формировала наш духовный и нравственный мир. В ней и сегодня мы черпаем мудрость, опыт и веру в себя. Поэтому 2022 год станет Годом исторической памяти*”[10]. Адзначым, што ў самім навагоднім звароце практычна адсутнічае любая канкрэтыка датычна зместа Года гістарычнай памяці, толькі мова ідзе пра ўмацаванне калектыўнай нацыянальнай ідэнтычнасці на аснове гістарычнай памяці. Не дадаў больш яснасці і ўказ №1 ад 1 студзеня 2022 года “Аб абвешчанні 2022 года Годам гістарычнай памяці”, дзе адказным дзяржаўным установам прызначаецца распрацаваць план мерапрыемстваў на гэты год. Характэрна, што

[9] https://www.youtube.com/watch?v=ijaVV5wixuw
[10] https://president.gov.by/ru/events/novogodnee-obrashchenie-1640948656

пасля Савета міністраў другой у пераліку адказных інстытуцый за Год гістарычнай памяці выступае Генеральная пракуратура, але гэта становіцца цалкам зразумелым, калі мы ўзгадаем, што фактычна гэтая інстытуцыя ўзяла пад свой кантроль выкананне Закона аб генацыдзе беларускага народа. Абвяшчэнне Года гістарычнай памяці і падпісанне Аляксандрам Лукашэнка гэтага закона практычна супалі па часе (1 і 5 студзеня), што дэманструе ўзаемасувязь гэтых ініцыятыў.

Неўзабаве (6 студзеня) на адмысловым паседжанні датычна "рэалізацыі гістарычнай палітыкі" Лукашэнка ў сваёй прамове агучыў новыя контуры праграмы інтэрпрэтацыі гістарычнага мінулага беларускай дзяржавай. Прамова досыць цікавая, паколькі ў ёй практычна не закранаецца ўжо адпрацаваная і зразумелая інтэрпрэтацыя Вялікай Айчыннай вайны, але шмат увагі надаецца іншыя перыядам беларускай гісторыі, наконт якіх адсутнічала празрыстая і пэўная пазіцыя беларускіх уладаў. Найдаўнейшы перыяд беларускай гісторыі (Полацкае і Турацкае княства) быў пазначаны як незаслужана зведзены ў цень, хоць нейкага вырашэння праблем трактоўкі гэтага перыяда (ці княствы былі незалежнымі ці мусім разглядаць іх як складовую частку Кіеўскай Русі?) на паседжанні прапанавана не было.

Ускладненне ж стасункаў з Польшчай і Літвой у апошнія гады было ўспрынята як непасрэдная нагода, каб правесці "нацыяналістычную" рэвізію мінулага, і адкінуць "навязаныя звонку" інтэрпрэтацыі. Але стаўленне да перыядаў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай выглядае радыкальна па-рознаму. ВКЛ было прапанавана разгледзець у якасці дзяржавы, дзе панаваў беларускі/рускі/славянскі элемент: "*А возьмите Великое княжество Литовское. Современные литовцы фактически приватизировали наследие этого государственного образования. Но что там было литовского? Язык - наш, на нем же написана и Конституция - Статут. Главенствующая вера - православие. Территория - в основном белорусская, украинская, частично русские земли. Народ на 80% - наш. Славяне. А это основные атрибуты и признаки государственности. Кроме того, когда на всю Европу гремели Полоцкое и Туровское княжества как центры духовности и просвещения, предки литовцев все еще жили во тьме язычества и вели примитивное хозяйство.*"[11] З аднаго боку, гэта лагічны працяг той тэндэнцыі нацыяналізацыі старажытнага мінулага, якая павольна назіралася ў апошнія гады ў нашай краіне, і якая найбольш яскрава выявілася ў выхадзе новай хвалі падручнікаў па гісторыі Беларусі, дзе ў падручніку па гісторыі Беларусі для 6 класа (2016 год) падкрэлівалася культурнай і эканамічнае панаванне беларускіх земляў у Вялікім Княстве Літоўскім. У такой антылітоўскай інтэрпрэтацыі гісторыі ВКЛ відавочныя і запазычанні з "заходнерускага" наратыву XIX стагоддзя (працы Каяловіча і Турчыновіча), паслядоўнікамі якога адкрыта сябе лічаць такія важныя постаці для беларускай дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі і навукі, як Ігар Марзалюк і Вадзім Гігін.

Калі падчас прамовы перыяд ВКЛ быў інтэрпрэтаваны праз стратэгію "прысваення", то перыяд Рэчы Паспалітай – праз стратэгію "адчужэння": "*Давайте в учебниках по истории, в замковых и музейных экспозициях так и назовем, например, период Речи Посполитой - оккупацией белорусской земли поляками. Этноцидом белорусов. А что это было для наших предков? Родной язык, культура, вера под запретом. Магнаты на собак меняли белорусских крестьян. Но народ выжил и сохранил свою самобытность*"[12]. Крытычнае стаўленне да

[11] https://www.belta.by/president/view/lukashenko-vystupil-za-adekvatnuju-otsenku-istoricheskih-periodov-vkljuchaja-vremena-vkl-i-rechi-478283-2022/

[12] Там жа

перыяду Рэчы Паспалітай мае свае даўнія традыцыі, яно дамініравала ў імперскай гістарыяграфіі (зразумела, і сярод "заходнерусаў"), было перанятае ў пачатковы перыяд станаўлення нацыянальнай гістарыяграфіі, панавала і ў савецкі перыяд (дзе "польскае" атаясамлялася з "панскім"). Фактычна толькі ў перыяд ужо незалежнай Рэспублікі Беларусь перыяд Рэчы Паспалітай быў перагледжаны ў пазітыўным ключы, як складовая частка беларускай гісторыі, і тыя ж постаці Тадэвушка Касцюшкі ці роду Радзівілаў былі паступова ўведзеныя ў беларускі нацыянальны пантэон. Але ва ўмовах абвастрэння стасункаў з Польшчай, абвіначванння прадстаўнікоў польскай і каталіцкай меншасці ў разгойтванні пратэстаў пад дырэктыву звонку, мы бачым своеасаблівы адкат назад. Агулам, стаўленне да старажытнай гісторыі Беларусі, агучанае на нарадзе Лукашэнка, па асноўных пазіцыях сугуснай "заходнерускай" версіі гісторыі, распрацаванай у XIX стагоддзі, якая мусіла ўзгадніць мясцовую самабытнасць і лаяльнасць імперскім уладам. Відавочна, што такая версія гістарычнай палітыкі накіравана на далейшае развіццё канфрантацыі з Польшчай і Літвою, і разам з тым будзе весці да далейшага збліжэння з Расіяй.

Разам з тым, ня трэба перабольшваць эфект гэтых сцверджанняў. Цалкам змяніць інтэрпрэтацыю гісторыі, якая была напрацаваная паслядоўным развіццё на працягу апошніх паўтары стагоддзя, досыць складана. Для гэтага патрэбныя і вялізарныя інтэлектуальныя рэсурсы, выпуск манаграфій, папулярызацыя на ўсіх узроўнях культурнай прадукцыі і г.д. Пакуль што ўлада абапіраецца на сілы некалькіх гісторыкаў (Марзалюк, Гігін, Даніловіч), што яўна мала для рэалізацыі такой складанай задачы. Зламаць "нацыянальную парадыгму" магчыма толькі праз досыць доўгі працэс выхавання новай генерацыі гісторыкаў, і незразумела, ці Лукашэнка мае такі рэсурс часу – і яўна, што Года гістарычнай памяці для гэтага недастаткова. Таксама незразумела, што ў такім выпадку рабіць з вялізарнымі рэсурсамі, выдаткаванымі на рэстаўрацыю і аднаўленне гістарычных помнікаў, замкаў і палацаў, а таксама стварэнне новых помнікаў.

Нішу па вызначэнню контураў "новай гісторыі" для Беларусі паспрабаваў перахапіць Вадзім Гігін, які пасля спробаў ціха адседзецца ў перыяд пратэстаў, быў выцягнуты на пярэдні фронт ідэалагічнай работы і з паста дэкана БДУ быў перакінуты на рэанімацыю таварыства "Веды", якое вяло практычна незаўважнае існаванне з савецкіх часоў. У якасці новага фармату працы быў выбраны рэжым штотыднёвых ролікаў[13] з абмеркаваннем спрэчных і дыскусійных тэмаў гісторыі Беларусі ("польскае паўстанне" 1863 года, перыяд Рэчы Паспалітай, Сталін і Беларусь), але нават з паўнавартаснай раскруткай праз дзяржаўныя медыі ролікі не набіраюць надзвычайнай колькасці праглядаў[14]. Застаецца спрэчным, наколькі такая медыяплатформа здольная радыкальна пераламіць сітуацыю ў гістарычным полі Беларусі (з вялізарнай колькасцю даследаванняў, папулярызатарскіх прац, і выбудаванай інфраструктурай гістарычнай спадчыны).

У цэлым жа абвешчанне Года гістарычнай памяці было ўспрынятае дзяржаўнай бюракратычнай машынай як чарговая нагода правесці абавязковыя мерапрыемствы патрыятычна-выхаваўчага кшталту ў сферы культуры і адукацыі. Пад эгіду Года гістарычнай памяці апынулася магчымым загнаць цалкам розныя мерапрыемствы (выстава пра гісторыю стварэння Нацыянальнага гістарычнага музея, адукацыйныя лекцыі ў Нацыянальнай бібліятэцы, бал у палацы Друцкіх-Любецкіх), хоць абсалютная большасць праведзеных мерапрыемстваў была звязаная з тэматыкай Вялікай Айчыннай вайны.

[13] Першы выпуск ад 19.01.2022: https://www.youtube.com/watch?v=Vwtm5c6zxWM
[14] Самы папулярны ролік "Сталін і Беларусь", выпуск ад 2 лютага, набраў 22.8 тысяч праглядаў.

**Прагнозы:**

1) Можна чакаць у бліжэйшыя часы некалькі судовых справаў, ініцыяваных Генеральнай пракуратарай, якія паспрабуюць звязаць палітычныя пратэсты 2020 года з законам пра генацыд беларускага народа (кшталту, апраўданне нацысцкай ідэалогіі пратэстоўцамі);
2) Спробы шэрага зацікаўленых “заходнерусаў” пад эгідай Года гістарычнай памяці перафарматаваць прынцыпы беларускай гістарычнай палітыкі ў дачыненні да перыядаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай маюць абмежаваны эфект: найбольш рэалістычна выглядае карта “нацыяналізацыі” перыяда ВКЛ, у той час як спроба праінтэрпрэтаваць перыяд Рэчы Паспалітай як час акупацыі будзе відаць прасабаціраванай.